© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013




TV

СПАДАРОЖНІКАВАЕ! ● БТ, РТР, Астанкіна, НТБ С.-Пецярбург, Польшча-1, Польшча-2.



*Аляксандр Дубко:* **«Час заняцца эканомікай ?»** *ст. 3*



Сапраўднае фальклорнае сьвята чакала тых, хто ў суботу наведаў фінал трэцяга гарадзкога фестывалю нацыянальных абрадаў.

*ст. 7*




7 і 8 сьнежня будзе хмарна, з праясьненьнямі, пераважна без ападкаў. Месцамі туман, слабы галалёд. Вецер усходні, 3-8 м/сек. Тэмпература ўначы -1-6 , а ўдзень -2+3 градусы.

# ПАГОНЯ

ЗАСНАВАНА Ў 1920 г

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

№ 49 (196) • 6 - 12 сьнежня 1996 г. • Кошт свабодны

## ІХ ХАТА З КРАЮ

**Дэпутаты гарадзенскага гарадзкога Савету робяць выгляд, што палітычныя зьмены ў жыцьці краіны іх не тычацца. На пачатку чарговай сваёй сэсіі, якая прайшла ў сераду, толькі чатыры народныя абраньнікі падтрымалі цалкам лагічную прапанову дэпутата Юрася Мацко вызначыць стаўленьне Савету да прынятай на рэфэрэндуме новай Канстытуцыі. Не атрымала падтрымку і прапанова дэпутата Віктара Швыркіна уключыць у павестку дня пытаньне аб падаткаабкладаньні на гарадзенскіх прадпрымальнікаў, якіх абурыла павышэньне з 1 сьнежня падаткаў на прыбытак.** За гэтую прапанову прагаласавалі толькі 18 з 61 прысутнага на сэсіі дэпутутаў. Такім чынам, сесія прайшла па распланаваным заранёў сцэнарыі. З справаздачай аб працы гарвыканкаму ў 1996 годзе выступілі мэр Горадні Анатоль Пашкевіч і яго намесьнікі. Пад час свайго выступу, у асноўным прысьвечанага эканамічным праблемам, старшыня гарвыканкаму «в духе времени» пакрытыкаваў «Пагоню» і «Свабоду», якія «всячески интерпретируют результаты референдума в Гродно». Анатоль Пашкевіч з гонарам паведаміў дэпутатам. што прэзідэнцкую Канстытуцыю падтрымаў у горадзе аж 51 працэнт ад усёй колькасьці выбаршчыкаў.

Гаворачы пра стан эканомікі горада, намесьнік старшыні гарвыканкаму Валянціна Лаўцэль адзначыла, што бюджэт горада, у адрозьненьні ад абласнога, выконваецца па плану. Але фінансавае становішча большасьці прадпрыемстваў застаецца цяжкім. Астранамічных паказчыкаў дасягнула запазыка энэргетыкам. Працягваецца скарачэньне вытворчасьці і , адпаведна, людзей. Другі намесьнік мэра - Яўген Жабрун, адзначыў, што ў горадзе не хапае 15 тысячаў школьных месцаў і ў той жа час замарожана будаўніцтва школаў у Дзевятоўцы , у Паўднёвым, на вуліцы Дамброўскага і Рэпіна. Катастрафічна не хапае грошай і на медыцыну. Адзін дзень знаходжаньня хворага ў шпіталі ўжо не ўкладаецца ў сто тысяч рублёў. Кепскае становішча склалася і ў экалогіі горада. Ці зьменіцца сітуацыя ў наступным годзе, залежыць ад таго, ці знойдзецца дастаткова сродкаў у бюджэце на 1997 год. Невядома пакуль і хто будзе зацьвярджаць гэты бюджэт. Тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў гарсавету ўжо скончыўся, а новы Савет яшчэ не абраны. На просьбу дэпутатаў пракаментаваць гэтую сітуацыю, старшыня гарсавету Фёдар Гудзей паведаміў, што дэпутацкія паўнамоцтвы падоўжаныя. Калі ж адбудуцца выбары новых дэпутатаў - будзе залежыць ад прэзідэнта.

## МАЎЧЫ - БУДЗЬ ХІТРЫМ!

**Начальнік Дзяржаўнай падаткавай інспекцыі па Гарадзенскай вобласьці Мікалай Фірулёў параіў гарадзенскім прадпрымальнікам асабліва не абурацца ўвядзеньнем з 1 сьнежня павялічаных фіксаваных падаткаў на прыбытак і мерамі па іх збору.**

На сваёй прэс-канферэнцыі, якая прайшла ўчора ў аблвыканкаме, ён заявіў:»Усе гэтыя мітынгі (меўся на ўвазе мітынг на рэчавым рынку) да добрага не прывядуць. Пасьля такіх вось выступленьняў прадпрымальнікаў у Менску, Гомелі і іншых гарадох ужо падрыхтаваны праект прэзідэнцкага указу аб адзіных для ўсёй краіны стаўках фіксаваных падаткаў. І тады гарадзенскія прадпрыймальнікі застануцца «у дурнях», бо нашыя стаўкі сёньня ніжэйшыя ў параўнаньні з тымі, якія плануюцца ў гэтым указе.»

Больш падрабязную інфармацыю з гэтай прэс-канферэнцыі чытайце ў наступным нумары «Пагоні».

## ЦІ БУДЗЕ РЫНАК СТРАЙКАВАЦЬ?

**3 сьнежня на гарадзкім рэчавым рынку ў пасёлку Паўднёвым прайшоў стыхійны мітынг прадпрымальнікаў. выкліканы павелічэньнем з пачатку месяцу падатку на прыбытак і метадамі, з дапамогай якіх улады плануюць яго зьбіраць.**

А 13-й гадзіне на аўтастаянцы ля рынку сабралася каля дзьвюх сотняў гандляроў.

***-Чаму вы сюды прыйшлі?-пытаюся ў купкі жанчын ўжо немаладога ўзросту.***

**Ірына Ч.**- Таму што і заўтра хачу прыносіць дахаты кавалак хлеба. Для мяне гандаль на рынку-адзіны сродак зарабіць на жыцьцё. Учора я даведалася, што прыйдзецца плаціць у пяць разоў большы падатак на прыбытак. У мяне такіх грошай няма.

**Марыя Б.**- Колькі можна быць дойнай каровай? Штомесяц плоціш спраўна падаткі, церпіш абразы накшалт «вшивых блох», а зцябе ўсё цягнуць, цягнуць, цягнуць...

*Да размовы далучаюцца ўсё новыя і новыя людзі. Кожны імкнецца выказаць набалелае. Галасы на магнітафоннай ленце зліваюцца ў адно і выявіць, хто і што канкрэтна казаў, ужо немагчыма.*

- За месца на рынку, за гэты кавалак зямлі безабаронны перад ветрам, сьнегам, дажджом мы плацім штомесяц па мільёну трыста тысячаў рублёў. Гэта ў дзесяць разоў больш, чым я плачу за сваю аднапакаёвую кватэру!

-Да гэтага часу я плаціў у квартал 200-300 тысячаў. Цяпер зь мяне патрабуюць 600 тысячаў. Прычым-наперад і зараз жа.

-Я на гэтым рынку гандлюю час ад часу. Чаму я павінен плаціць толькі ж , колькі тыя, што сядзяць тут штодня?

-Пра падатак нам паведамілі за два дні да пачатку месяца. Што гэта, як не зьдзек над намі?

-Мяне абурае тое, што я вымушаны плаціць падатак з прыбытку, самога прыбытку яшчэ не маючы. А што, калі мой тавар не пойдзе, калі я захварэю і г.д.? Згодна новага парадку падаткаабкладаньня, ніхто ў такім выпадку грошы мне назад не зьверне.

-Я стабільна плачу ўсе падаткі за гандаль на рынку. А што за гэта маю? Можа пабудавалі абяцаную тралейбусную лінію да рынку і мне не прыдзецца больш гадзіны ехаць кіламетр да горада ды паліць літры бянзіны? Можа пабудавалі абяцаныя туалеты ці правялі сьвятло на рынку? Затое, драць як ліпку не забываюцца. Хопіць! Надакучыла!

*Узгадваю прысутным пра тое, што 29 лістапада на сэсіі абласнога Савета, дзе і былі па прапанове аблвыканкаму зацьверджаны новыя стаўкі падаткаў, дэпутатам паведамілі, што гэтае рашэньне прынята па ўзгадненьню з прадпрымальнікамі.*

-Гэта проста сьмешна. Ніхто ніколі не цікавіўся, як нам даюцца ўсе гэтыя падаткі. Я проста не ўяўляю сабе чалавека, які скажа:»Бярыце, абдзірайце мяне!».

***-У вас ёсьць спадзяваньне, што ўлады пераглядзяць сваё пытаньне?***

-Ёсьць. Таму мы тут і сабраліся.

***-А калі стаўкі падатку на прыбытак і метады іх збору не зьменяць?***

- Мы гэтага так не пакінем. Будзем змагацца да канца. Калі не прымуць нашыя прапановы-будзем баставаць. Створым свой прафсаюз, каб адстойвалі нашыя правы...

*Апошняя думка дамінавала і на самім мітынгу. Яго ўдзельнікі абралі аргкамітэт, які дакументальна аформіць усе патрабаваньні і прапановы прадпрымальнікаў . Да канца тыдня петыцыя з подпісамі гандляроў павінна была трапіць на стол першых асоб вобласьці. Не здымаецца з павесткі і пытаньне аб стварэньні ўласнага прафсаюза.*

**В.Руднік**

## АМБАСАДАР - КАЧАГАР?

**На прэзентацыю кацельні «Лідбудматэрыялаў» кампанія сабралася надта пажондная, на чале з амбасадарам Францыі на Беларусі Клодам Жуліфам ды камерцыйным дарадцам Дамінікам Граншэ.** А прычынай стала тое, што ў новай кацельні ўстаноўлена абсталяваньне , якое выпушчана сумесным францускa- беларускім прадпрыемствам «Камконт» , утвораным на базе Гомельскага завода «Камунальнік». Кацельня працуе на адыходах дрэваапрацоўчай прамысловасьці: ад пілавінаў і кары да брускоў 200 на 300 міліметраў. І калі раней «Лідбудматэрыялы» вывазілі на звалку да дзьвюх тысячаў тон адыходаў, то зараз будуць мець з іх эканомію ў 3 мільярды 400 мільёнаў рублёў штогод.

**Яраслаў Грынькевіч.**

## НАМ МАСЛА НЯ ТРЭБА- ГАРЭЛКУ ДАВАЙ!

Дзятлаўскі сырзавод зьбіраецца засвоіць у найбліжэйшы час выпуск новай прадукцыі - сьпірту з малочнай сыроваткі. З гэтай сыравіны кемлівыя сыраробы зьбіраюцца рабіць гарэлку «Пасольскую» ды моцныя настойкі. Алкагольны праект гатова падтрымаць абласная выканаўчая ўлада. Пра гэта на апошняй сесіі аблсавету паведаміў старшыня аблвыканкаму Аляксандр Дубко. Ён, аднак, параіў не сьпяшацца дзятлаўчанам запускаць набытае абсталяваньне па вырабу масла , спаслаўшыся на тое, што завадзкія лініі у суседскіх раёнах (у прыватнасьці, у Наваградку) і так загружаныя ўсяго на 20 працэнтаў.

**Віктар Людвіковіч.**

## А КАЛІ Б НЕ ДАПАМОГА?

Чарговая партыя гуманітарнай дапамогі з Германіі прыйшла на адрас дабрачыннай каталіцкай арганізацыі «Карытас» у Гародні. З парафіі Шпайер на Гарадзеншчыну прывезьлі стаматалагічнае абсталяваньне , прадукты харчаваньня, вопратку ды іншыя рэчы. Вялікая партыя медыкаментаў і медыцынскага абсталяваньня на адрас «Карытас» у найбліжэйшы час чакаецца і з Францыі.

Як зазначыў на апошняй сесіі гарсавету намесьнік старшыні гарвыканкаму Яўген Жабрун, толькі дзякуючы гуманітарнай дапамозе з Захаду медыцынскім установам Горадні ўдаецца хоць неяк здабываць неабходныя лекі. У дзяржавы на гэтыя мэты проста не хапае грошай.

**В.Анінуцкі**

## РАНЕЙ БАЦЬКІ...

У Горадні да гэтага часу не распачалася выдача грамадзянскіх пашпартоў новага ўзору. Як паведаміў «ПАГОНІ» начальнік пашпартна-візавай службы ўпраўленьня ўнутраных справаў аблвыканкаму Мікалай Якубовіч, дастатковая колькасьць новых пасьведчаньняў асобы ў Горадню ўжо прывезена. Планавалася, што першыя пашпарты ўрачыста будуць ўручаныя 22 лістапада. Але з Менску прыйшла каманда перанесьці ўрачыстасьці на пазьнейшы тэрмін, які вызначыць Адміністрацыя прэзідэнта. Урачыстая выдача пашпартоў пачнецца па ўсёй краіне адначасова. У Менску выдаваць дакуманты будзе прэзідэнт, а на месцах - старшыні аблвыканкамаў.

Сп.Якубовіч пацьвердзіў, што паралельна з новымі пашпартамі пэўны час будуць ужывацца старыя (савецкага ўзору). Да прыкладу, тэрмін дзеяньня існых замежных пашпартоў устаноўлены да 31 сьнежня 2001 года.

**Вітаўт РУДНІК.**




## СУПРАЦЬ ДЫКТАТУРЫ - АДЗІНЫМ ФРОНТАМ

**3 сьнежня адбылася рабочая сустрэча кіраўніцтва БНФ і АГП. На ёй ішла размова аб больш цеснай каардынацыі дзеяньняў у супрацьстаяньні таму, што адбываецца зараз на Беларусі.**

У прыватнасьці, кіраўніцтва БНФ выказалася за тое, каб Аб'яднаная грамадзянская партыя, выкарыстоўваючы свае шматлікія сувязі сярод расейскіх дэмакратаў, актыўней тлумачыла рэальную палітычную сітуацыю на Беларусі. Гэтая тлумачальная праца асабліва актыўна павінна праводзіцца сярод расейскіх парламантарыяў.

Размова ішла таксама аб далейшай сумеснай падрыхтоўцы розных акцыяў, таму што зараз, пасьля адх8ленньня апазіцыйнай часткі парламанту, супрацьстаяць дзеяньням уладаў, якія вядуць да канчатковай страты суверэнітэту Беларусьсю, няма каму. Акцыі апазіцыі ў сакавіку-красавіку ў сталіцы рэспублікі, накіраваныя супраць маскоўскіх пагадненьняў, падпісаных Лукашэнкам, паказалі, што такая форма барацьбы можа быць даволі эфектыўнай, заўважыў на прэс-канферэнцыі выканаўца абавязкаў старшыні БНФ Лявон Баршчэўскі.

На сустрэчы абмяркоўваліся пытаньні, зьвязаныя са стварэньнем сумеснага ценявога кабінету міністраў, з улікам і на базе таго, які існуе зараз.

На пытаньне, ці магчымыя кансультацыі БНФ і з іншымі палітычнымі сіламі Беларусі, Л.Баршчэўскі адказаў станоўча. У прыватнасьці, Юрый Хадыка, як удзельнік «круглага стала», падтрымлівае сувязі з Партыяй камуністаў Беларусі. Кансультацыі праводзяцца таксама з Беларускай сялянскай партыяй.

## СЁНЬНЯ КІРУЮЦЬ НЕЛЕГІТЫМНЫЯ

**Беларускі Народны Фронт лічыць, што рашэньні новага парламанту ня могуць быць прызнаныя законнымі ні беларускімі грамадзянамі, ні міжнароднай супольнасьцю.**

У адпаведным звароце кіраўніцтва БНФ заяўляе, што «рэжым у чарговы раз пайшоў на парушэньне міжнародных нормаў і палажэньняў Канстытуцыі Беларусі: сфальсіфікаваныя вынікі кансультацыйнага рэферэндуму па праектах новай Канстытуцыі аб'яўлены абавязковымі, сфарміраваны так званы «новы парламант», у якім у канчатковым выніку... прадстаўлены дэпутаты,.. абраныя толькі на 43 працэнтах выбарчых участкаў Беларусі». Аўтары звароту таксама сьцьвярджаюць, што, паколькі ў Палаце прадстаунікоў прадстаўлена менш чым 1/8 выбаршчыкау сталіцы Беларусі - Менску, - то рашэньні гэтага воргану ня могуць быць легітымнымі. Акрамя таго, у звароце адзначаецца, што «вынікі рэферэндуму падведзеныя ворганам, які ня меў нават неабходнага кворуму». Узгадваюцца таксама грубыя парушэньні Закону аб рэферэндуме.

Кіраўніцтва БНФ асуджае пазіцыю афіцыйнай Масквы, якая, як адзначаецца ў звароце, фактычна адобрыла злачынныя дзеяньні беларускіх уладаў. Больш за тое, БНФ лічыць, што тым самым «расейскае кіраўніцтва кінула выклік сусьветнай супольнасьці, якая адэкватна ацаніла тое, што адбываецца у Беларусі».

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

## З.ПАЗЬНЯК: НЯМА ПЕРСПЕКТЫВЫ Ў ХУНТЫ.

**Замежнае грамадзтва працягвае цікавіць праблемы, зьвязаныя з рэферэндумам, якi прайшоў на Беларусі. Радыё «Бі-Бі-Сі» ўзяло інтэрв'ю у лідара БНФ Зянона Пазьняка. Ён , у прыватнасьці , сказаў:**

- Зараз апазіцыя будзе змагацца перманентным чынам : каб адбываліся мітынгі, дэманстрацыі, пікеты і іншыя праявы нязгоды...

***- Шмат аглядальнікаў падкрэсьліваюць, што А.Лукашэнка быў абраны дэмакратычным шляхам. Ці не адбываецца так, што толькі апазіцыйная меншасьць у Менску выступае супраць улады А.Лукашэнкі?***

- Гэта толькі домыслы рэпарцёраў , у якіх няма ніякага здаровага сэнсу... Большасьць насельніцтва падтрымлівала Гітлера , 90 працэнтаў выбралі яго і канцлерам , і прэ зідэнтам; 99% падтрымлівалі камуністычную партыю ў СССР. У таталітарных рэжымах заўсёды так.Увогуле,а якога дыктатара не выбірае народ? Усіх выбіраў.

***-Паколькі сітуацыя ў вялікай ступені залежыць ад Масквы , то што ў такім выпадку залежыць ад беларусаў?***

- Ня згодны. Сёньня іншая сітуацыя,нават не такая, якая была 4-5 месяцаў таму. Цяпер сітуацыя залежыць ад міжнароднага супольніцтва.

Калі я эміграваў з Беларусі вясной гэтага году, то заўважыў, што на Захадзе Беларусь была выкрэслена з кнігі палітычнага жыцьця. Амерыка махнула рукой- няма ўжо гэтай дзяржавы. Але пасьля масавых пратэстаў сітуацыя цалкам іншая.Яна прымусіла павярнуцца да Беларусі тварам: вынікаў рэферэндуму ніхто не прызнаў. А тое , што Масква праводзіць сваю палітыку- яна яе заўсёды праводзіла , і прайгравала. Прайграе і зараз. Незадавальненьне будзе расьці, бо ніякай эканамічнай перспектывы ў гэтай хунты няма. Ад Масквы сітуацыя не залежыць. У апошні побыт у Польшчы заўважыў, як зьмянілася ўспрыняцьце палякамі беларускіх спраў. Раней палякі ставіліся з пагардаю: што за народ, што адмовіўся ад Айчыны, ад мовы (прайшоў першы рэферэндум). Але палякі зразумелі, што за рэжым на Беларусі. Прэм'ер В.Цімашэвіч паведаміў , што будзе прадстаўляць палітычны прытулак беларускім палітэмігрантам. Сейм заявіў, што не прызнае вынікаў рэферэндуму. Хельсінскія камітэты зьвярнуліся з ініцыятывай стварэньня камісіі па разгляду парушэньня на Беларусі правоў чалавека.

Аналагічная сітуацыя і ў іншых краінах. Не ад Масквы будзе ўсё залежыць.

***- Гэтыя пратэсты могуць скончыцца крывёю?***

-Не выключаецца. Але ня думаю, каб адбылася вялікая маніфестацыя, каб выйшлі сотні тысячаў людзей .Хіба што ўлады зробяць нешта жудаснае. Думаю, што змагацца будзе Народны Фронт, моладзь, працоўныя: няма выйсьця з эканамічнай сітуацыі.

## ДВАІХ УЖО НЕ ПАСАДЗЯЦЬ

**У мінулым нумары «Пагоня» пісала аб арышце ў Берасьці грамадзяніна Украіны Аляксея Лычковаха і грамадзянаў Беларусі Янкі Чурыловіча і Ігара Кандрацьева. За выяўленьне фальсіфікацыі на выбарчым участку N 9 Маскоўскага раёну Берасьця, іх абвінавацілі ў злосным хуліганстве. Але беларускім уладам наўрад ці ўдасца адпомсьціць сьведкам, якія бачылі, як рабілася «ўсенародная» падтрымка прэзыдэнта.**

Аляксея Лычковаха 28 лістапада вызвалілі з- пад стражы, узяўшы падпіску аб нявыезьдзе. На наступны дзень супрацоўнікі міліцыі самі параілі яму зьехаць на радзіму. Што спадар Лычковах і зрабіў.

Янку Чурыловіча сьледчыя паслалі за здымкамі, якія ён зрабіў на выбарчым участку. (Два з іх надрукаваны ў мінулым нумары «Пагоні»). Але Янка, як толькі выйшаў з міліцыі, сеў на цягнік і выехаў у Польшчу. Там ён зьвярнуўся да польскіх уладаў з просьбай аб палітычным прытулку. Звычайна ў Польшчы такія справы разглядаюцца на працягу больш паўгадовага тэрміну. Але ў выпадку Чурыловіча можа быць выключэньне, магчыма ён атрымае статус палітычнага ўцекача хутчэй. Пазаўчора «Пагоня» атрымала інфармацыю з Кіеву: Камітэт Выбаршчыкаў Украіны зьбіраецца даслаць у МУС Польшчы ліст з просьбай як найхутчэй дапамагчы Чурыловічу.

Па зьвестках, пададзеных дырэктарам бюро па справах міграцыі і ўцекачоў МУС Польшчы Томашам-Кубай Казлоўскім, ужо восем грамадзянаў Беларусі зьвярнуліся ў ягоную арганізацыю з просьбай аб палітычным прытулку.

Ігар Кандрацьеў,трэці абвінавачаны па справе, зьвязанай з падзеямі ў Берасьці 24 лістапада, нікуды не ад'ехаў. Яму не дазваляе гэта зрабіць сан. Ігар- грэка-каталіцкі сьвятар. Абвінавачаньне супраць яго пакуль не зьнята.

**Дз.Кісель.**

## ЯК ЛУКАШЭНКА Ў МАЛАДЭЧНЕ МІТЫНГ ПРАВЁЎ І ПЕРАМОГУ АТРЫМАЎ

**Шмат розных супярэчных меркаваньняў і думак выклікае ход і вынікі нядаўна праведзенага рэферэндуму, у прыватнасьці , у Маладэчне. І хаця галасаваньне афіцыйна было аб'яўлена з 9 лістапада, гарадзкія выбарчыя ўчасткі пачалі сваю працу з 11. Цікава, што ў запрашэньнях, разасланых выбаршчыкам , а ні слова не ўпаміналася пра давыбары ў Вярхоўны і мясцовы Савет(забягаючы наперад, паведамлю, што ён нарэшце з трэцяга разу абраўся). Відавочна, што для мясцовай вертыкалі з рэферэндумам, за вынікі якога яны адказвалі сваёй галавой, гэтая праблема была, несумненна, другараднай.**

Для дасягненьня сваіх пераможных мэтаў былыя дэмакраты, аказаўшыся на самой справе ўгоднымі прыстасаванцамі, стварылі гарадзкі штаб па каардынацыі падрыхтоўкі і правядзеньня рэферэндуму на чале з намесьнікам старшыні выканкаму Д.Жук. На працягу некалькіх месяцаў, выкарыстоўваючы ваенную тэрміналогію, гэты штаб зацята змагаўся за галасы, ці то 68 тысячаў(дадзеныя з «Маладзечанскай газеты» N 113 Д.Жук), ці то 71140 выбаршчыкаў (дадзеныя з той жа газеты N116 гарадзкой выбарчай камісіі).

Менавіта іхнімі высілкамі адбылося ня толькі «прамываньне мазгоў» насельніцтва гораду, але і добраахвотна-прымусовае галасаваньне ў традыцыйна пасіўных да выбараў інтарэсу інтэрнатах, дзе ўжо на 16 лістапада прагаласавалі ўжо каля 57% выбаршчыкаў. Характэрна, што на гэты час на ўсіх гарадзкіх выбарчых участках адсутнічаў ня толькі тэкст праекту Канстытуцыі ВС, але і за выпадкам аднаго ўчастку і кабінкі для тайнага галасаваньня. А для таго, каб выбаршчыкам правільна зарыентавацца ў пытаньнях рэферэндуму, на кожны ўчастак гарвыканкам выдзяляў свайго «тлумачальніка», не гаворачы ўжо аб шчодра разьвешанай узорна-прэзідэнцкай нагляднай агітацыі. Не сьціхаў і паток хлусьні і дэзінфармацыі,якая бесперапынна ішла з раніцы да вечара з нашага радыё і тэлевізару, у тым ліку з вуснаў Лукашэнкі, абвясьціўшага 23 лістапада па БТ аб праведзеным ў яго падтрымку агульнагарадзкім мітынгу ў Маладэчне , якога на самой справе не было.

Усё ж, нягледзячы на такі ход падзей, «перамога» нашага геніалісімуса на рэферэндуме па сваёй Канстытуцыі ў Маладэчне ў 53% выглядае ня вельмі унікальна і пераканаўча пры тым, што мясцовая вертыкаль упершыню за многія гады , з «помпай» правёўшы на афіцыйным узроўні сьвяткаваньне 7 лістапада, выкарыстала ня толькі гарадзкую філію ПКБ,якая цалкам падтрымлівае Лукашэнку(дзіўна,чаму яна не КПБ ) , але і ўвесь камуністычны электарат.

**Алесь Цадко**

## КАЛІ Ў ЭЎРОПЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АЎТАРЫТАРНЫ РЭЖЫМ, ТО ГЭТА...

Калісьці савецкія гісторыкі за тое, што ў Германіі да ўлады прыйшоў фашызм, ускладвалі віну на міжнародныя манаполіі, асабліва на тыя з іх , што так ці інакш былі заняты вытворчасьцю зброі. Савецкія гісторыкі хоць і былі камуністамі, але ў значнай ступені былі і гісторыкамі. Таму сеньня, калі зноў ў цэнтры Еўропы ўзнік таталітарны рэжым, мэтазгодна зірнуць на навакольны сьвет і паглядзець, каму можа быць гэта выгадна.

На Захадзе ў большасьці структураў працуюць людзі, якія ведаюць, што і калі трэба. Таму вядомае інтэрвію нашага Прэзідэнта з пахвальбой у бок Гітлера зьявілася менавіта тады , калі гэта было трэба. Калі трэба, прайшла і паездка А. Лукашэнкі ў Францыю, дзе ён «вывучыў» французскую сістэму ўлады. Калі трэба, пачаліся пасоўваньні ў бок пашырэньня НАТА. Калі трэба, Захад прамаўчаў наконт Беларуска-Расейскай супольнасьці і ідэі рэферэндуму. Дакладней, маўчаў ня ўвесь Захад, а маўчалі ўплывовыя сілы, якія, як ні дзіўна, ўплывовыя толькі таму і перш за ўсё таму, што завязаны на індустрыю ўзбраеньня. Заходняму вайскова-прамысловаму комплексу (ЗВПК), калі ўмоўна яго так называць, вельмі патрэбны крыклівы ,авантурысцкі, агрэсіўны фюрэр ў Еўропе. А. Лукашэнка як найлепей падышоў на гэтую ролю. Беларусь краіна малая, рэальнай сілы ня мае, але знаходзіцца ў надта патрэбным месцы, як сетка пасярэдзіне стала для пінг-понгу. Дзеячы ЗВПК, безумоўна, былі нават зацікаўлены, каб Беларусь мела ракетку-другую, а антызаходній істэрый ў «бацькі» і сваёй хопіць. Такая Беларусь, і такіе правадыр для ЗВПК - знаходка. Гэта прыём у НАТА новых сяброў. Гэта пераўзбраеньне іх арміяў, гэта перашкаленьне іх асабовага складу, гэта грошы, грошы, грошы. Няважна чые, але вядома, у чыю кішэню. Але такая "агрэсіўнасць" Захаду тут жа знаходзіць паразуменьне ў Маскве: у Ілюхіна, Жырыноўскага і, вядома, Расейскага ваенна-прамысловага комплексу (РВПК). Таму што агрэсіўнасьць Захаду - гэта ўжо грошы для Расейскага ВПК. І таму Лукашэнка патрэбны і Расеі, і ў той жа якасьці. Таму і ня могуць беларускія інтэрдэмакраты дабіцца хоць якой дапамогі ў Маскве.

Але на гэтым фоне зусім нелагічным выглядае раптоўны вывад расейскіх ракетаў з Беларусі. Гэта быццам бы падрываe ўсю сістэму, але толькі калі не ўнікаць у глыбіню сітуацыі ў Расеі. У Расеі, нягледзячы на шматлікасьць формаў барацьбы, ўся яна зводзіцца да барацьбы дзьвюх кланаў: клану імперыялістаў, для якіх ня важная форма ўлады, а важная толькі форма краіны - імперыя, і клану капіталістаў, для якіх ня важна форма краіны, нават яе памеры, а важная ўласнасьць і грошы. Першы клан рэпрэзентаваны ВПК, другі - Газпрамам. Некаторы час іхнія інтарэсы супадалі. Асабліва на пачатак вайны ў Чачні. Газпрам змагаўся за сваю нафту, а ВПК - за саае пастаўкі зброі. І гэтая вайна магла ісьці ў інтэрэсах абодвух кланаў, каб не ўмяшаўся Лебедзь. Лебедзь парушыў раўнавагу. Ён паспрабаваў здаць нафту, але захаваць цэласнасьць імперыі. Здалі Лебедзя, але нафту ўжо не вярнуць. Таму вырашылі здаць ўсю Чачню, а заадно «насаліць «ВПК на заходнім кірунку. Абезракечваньне Лукашэнкі зьмяншае ягоную значнасьць - як генератару агрэсіўнасьці, выбівае частку козыраў у ЗВПК, але толькі частку.

Гульня працягваецца . Шарык палітычнага пінг-понгу лётае над беларускай сеткай. Ракеткі па абодвух баках у моцных руках.

**Станіслаў Суднік.**

## УСЁ ЯШЧЭ ЎГАВОРВАЮЦЬ

**АБСЕ заклікала беларускага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку адысьці ад унутрыпалітычнай барацьбы за уладу.**

Старшыня АБСЕ Флавіо Коцi зьвярнуўся пасьля гутаркі з прэзідэнтам Беларусі да беларускіх уладаў з патрабаваньнем павагі да апазіцыі і ўступленьня ў дыялог з ёю. Апрача таго, Лукашэнка павінен гарантаваць свабоду прэсы і доступ да сродкаў масавай інфармацыі членаў апазіцыі. Ф.Коці яшчэ раз выказаў занепакоенасьць АБСЕ становішчам у Беларусі і заклікаў А.Лукашэнку лічыцца з нормамі і прынцыпамі гэтай арганізацыі.

**УНІАН — DPA — БелаПАН.**

## РЭФЕРЭНДУМ—ПАДМАН БЕЛАРУСКАГА НАРОДУ

**Выступаючы на брыфінгу 26 лістапада, прадстаўнік Дзярждэпартаманту ЗША Нікалас Бернс заявіў, што, мяркуючы па ўсіх ацэнках, рэферэндум, праведзены прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, зьявіўся падманам беларускага народу.** Ён паведаміў, што было вырашана не пасылаць прадстаўнікоў амерыканскага пасольства ў Менску сачыць за ходам рэферэндуму. Па словах прадстаўніка Дзяржэпартаманту ЗША, няма магчымасьці праверыць афіцыйныя сьцьвярджэньні беларускага ўраду аб такой высокай яўцы выбаршчыкаў. «Няма ніякіх незалежных рычагоў, каб пераканацца. У нас вельмі шмат пытаньняў наконт гэтага. І мы адрасавалі ўсе гэтыя пытаньні беларускаму ўраду», — сказаў спадар Бернс. Адказваючы на пытаньне, што яшчэ можна зрабіць, каб нейк паўплываць на прэзідэнта Лукашэнку з прычыны таго, што пакуль ніщто не змагло прымусіць прэзідэнта зьмяніць свой курс, спадар Бернс сказаў: «Я лічу, зараз вельмі важна, каб усе мы на міжнародным узроўні асудзілі антыдэмакратычны стыль кіраўніцтва прэзідэнта Лукашэнкі». Па яго словах, Злучаныя Штаты не адзінокія, іх падтрымліваюць іншыя краіны, у тым ліку амаль усе суседзі Беларусі. І прэзідэнту Лукашэнку прыйдзецца з гэтым лічыцца, таму што ён мае намер будаваць нармальныя эканамічныя і палітычныя адносіны з еўрапейскімі краінамі і, натуральна, з ЗША. Спадар Бернс падкрэсьліў, што Злучаныя Штаты ня змогуць мець «нармальныя пазітыўныя адносіны з урадамі, якія зьяўляецца антыдэмакратычным па сваёй сутнасьці».

**Іван МІХАЙЛАЎ.**

## НАДЗЕЯ ПАМІРАЕ АПОШНЯЙ

**3 сьнежня, пасьля вяртаньня з бальніцы, старшыня Канстытуцыйнага суду Беларусі Валерый Ціхіня напісаў заяву аб адстаўцы. Яна адрасавана Вярхоўнаму Савету 13-га скліканьня, які кіраўнік КС лічыць легітымным заканадаўчым органам. У заяве Ціхіні адзначаецца, што ён даваў прысягу на вернасьць служэньню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятай 15 сакавіка 1994 года.**

«Як старшыня Канстытуцыйнага суду, я узяў на сябе абавязак добрасумленна і непрадузята абараняць канстытуцыйны лад і вяршэнства Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, - гаворыцца у заяве. - Сваёй практычнай дзейнасцю я імкнуўся трымацца гэтай прысягі. 24 лістапада 1996 году ў Рэспубліцы Беларусь праведзены рэферэндум, вынікі якога з-за шэрагу прычынаў нельга прызнаць легітымнымі. Акрамя таго, насуперак заключэньню КС ад 4 лістапада 1996 году, прэзідэнцкаму праекту Канстытуцыі нададзены абавязковы характар з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі. Па сутнасьці, учынены акт прававога вандалізму. У У гэтых умовах я не магу далей выконваць абавязкі старшыні КС РБ». Падобныя заявы аб адстаўцы падалі таксама намесьнік старшыні Канстытуцыйнага суду Валерый Фадзееў, канстытуцыйныя судзьдзі Міхаіл Пастухоў і Аляксандр Вашкевіч. Пры гэтым В.Фадзееў адрасаваў сваю заяву прэзідэнту, М.Пастухоў і А.Вашкевіч - Вярхоўнаму Савету 13-га скліканьня. Каментуючы дзеяньні сваіх калегаў, Валерый Ціхіня выказаў меркаваньне, што гэтыя заявы аб адстаўцы не апошнія.

На прэс-канферэнцыі 4 сьнежня Валерый Ціхіня абверг абвінавачаньні у свой адрас з боку некаторых сродкаў масавай інфармацыі ў тым, што ён быццам здрадзіў інтарэсам дэмакратыі.

Свой удзел у Пагадненьні, падпісаным у ноч з 21 на 22 лістапада ў прысутнасьці высокапастаўленых афіцыйных асоб Расіі, В.Ціхіня растлумачыў сваім імкненьнем пазьбегнуць магчымага крывапраліцьця і да сягнуць грамадзянскага міру. Ён таксама паведаміў, што падчас сваіх сустрэч з прэзідэнтам А.Лукашэнкам 19 лістапада паспрабаваў пераканаць кіраўніка дзяржавы ў тым, што прапанаваны ім праект Канстытуцыі ня можа быць прыняты ў якасьці Асноўнага закону.

Валерый Ціхіня падчас прэс-канферэнцыі заявіў, што ня будзе прысягаць на вернасьць прэзідэнцкай Канстытуцыі, адзначыўшы пры гэтым, што «яшчэ ня ўсё страчана і краіна можа ўвайсьці ў прававое поле». Перш за ўсё, лічыць кіраўнік КС, калі яго заява аб адстаўцы будзе прынятая да разгляду Вярхоўным Саветам 13-га скліканьня, то гэта будзе азначаць, што гэты ворган зноў функцыянуе. Акрамя таго, на думку Ціхіні, прэзідэнт павінен выканаць рашэньне КС ад 4 лістапада 1996 году, згодна з якім рэферэндум носіць нeабавязковы характар; цяперашняй жа Канстытуцыі павінен быць нададзены статус канстытуцыйнага праекту. Акрамя таго, па словах Ціхіні, прэзідэнт павінен адмяніць 17 сваіх указаў, прызнаных незаконнымі Канстытуцыйным судом. Калі гэтага не адбудзецца, лічыць В.Ціхіня, то Беларусі пагражае міжнародная ізаляцыя і поўная адсутнасьць інвестыцыяў.

**Уладзімір ТРАЦЬЦЯКОЎ.**




БЕЛАРУСЬ — ВЯЛІКАЯ ДУЛЯ МАСКВЕ

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# БУДЗЕЦЕ ГУЛЯЦЬ ПА НАШЫХ ПРАВІЛАХ

**28-29 лістапада ў Горадні праходзіла сесія абласнога Савету дэпутатаў. Прысутны на ёй старшыня аблвыканкаму паведаміў, што вертыкаль пасьпяхова выканала вялікую палітычную задачу па правядзеньню рэферэндуму, і цяпер можна заняцца эканомікай.**

Галоўным пытаньнем быў аналіз працы прамысловасьці вобласьці. Прамову трымаў намесьнік старшыні аблвыканкаму сп. Міхаіл Бяляеў. Парадаваўшы напачатку дэпутатаў пасьпехамі «вертыкалі» ў «сдерживании дальнейшего падения» эканомікі сп. Бяляеў большую частку свайго выступу мусіў гаварыць пра сапраўдны эканамічны крызіс, які паглынуў большасьць прадпрыемстваў вобласьці.

Пакуль выканаўчая ўлада вырашала свае «палітычныя задачы», колькасьць стратных прадпрыемстваў да канца году вырасла ў 2 разы (з 25 да 50). Запазыка бюджэту такіх гігантаў прамысловасьці як Смаргонскі завод аўтаагрэгатаў, шклозавод «Неман», вытворчае аб'яднаньне «Хімвалакно» ды іншых вылічаецца мільярдамі рублёў. Сто дваццаць шэсьць прадпрыемстваў на працягу году спыняліся і прастойвалі. Страты працоўнага часу склалі два мільёны 64 тысячы салавекадзён. Працягвае расьці беспрацоўе. За 10 месяцаў гэтага году на працу ўладкавалася толькі 12.5 тысячаў чалавек, у той час як звольнілася 19.3 тысячы. Не пазайздросьціш асабліва і тым, хто застаўся пакуль на вытворчасьці. Да нізкай заробнай платы (на некаторых прадпрыемствах яна ніжэй за рысу беднасьці) з кожным днём дадаецца пагроза здароўю і нават жыцьцю. Больш паловы абсталяваньня на прадпрыемствах вобласьці патрабуе замены. Сорак тысячы тысячы чалавек (амаль палова усіх занятых у прамысловасьці) працуюць у шкодных для здароўя ўмовах. Так, на 33 праверанкых прадпрыемствах Ваўкавыскага раёну на 30 выяўлена завышэньне ўсяляких нормаў канцэнтрацыі шкодных рэчываў. Эканомія на людзкім здароўі толькі ў гэтым годзе каштавала жыцьця 29 чалавекам. Яшчэ 11 атрымалі на вытворчасьці іншыя траўмы.



Прычына эканамічнага крызісу кіраўніцтва гарадзенскай вертыкалі па-ранейшаму бачыць у тым, што «некоторые руководители оправдывают свою бездеятельность безысходностью сложившейся ситуации ...не в состоянии без опеки сверху решить проблемы» (М.Бяляеў).

Іншы пункт гледжаньня выказаў генеральны дырэктар вытворчага аб'яднаньня «Ваўкавыскцэментшыфер» Ю. Данішчык: «Я аб'ездзіў амаль усю Еўропу і цяпер разумею, чаму людзі на Захадзе добра працуюць і добра зарабляюць. Уся справа ў стаўленьні да закону, які паважаюць і прэзідэнт, і рабочы аднолькава. Прэзідэнты прыходзяць і адыходзяць, а законы застаюцца. Спадзяюся, што і мы калі-небудзь будзем жыць не па законах «зьверху» рашэньнях, якія сёньня прымаюцца, а заўтра адмяняюцца...» Словы сп. Данішчыка аднак засталіся «гласом вопиющего в пустыне». Старшыня гарадзенскага аблвыканкаму Аляксандр Дубко заявіў, што ўсім кіраўнікам прыйдзецца гуляць «па нашых правілах». Гэтае выказваньне найперш тычыцца прадпрыемстваў, якія зьбіраюцца стаць акцыянернымі «без согласования» з уладамі. У якасьці прыкладу сп. Дубко прыгразіў аднаму з такіх прадпрыемстваў -ваўкавыскаму «Беллакту» - «повернуть колхозы и совхозы, которые поставляют туда сырьё, на Берестовицу и т.д.», калі кіраўніцтва прадпрыемства «не захочет поделиться акциями с доярками».

Сп. Дубко таксама падзяліўся з дэпутатамі сваімі ўражаньнямі ад рэферэндуму: «Лично у меня настроение намного лучше стало...Мы не настаивали на участии в референдуме каждого, но хотели, чтобы как можно больше наших людей проголосовало... Есть у нас недоработки в плане отдельных предприятий. Я прошу посмотреть списки, где менее активно голосовали...»

Для чаго гэта патрэбна, старшыня аблвыканкаму дэпутатам не паведаміў. Магчыма, наперадзе новыя вялікія палітычныя задачы, якія запатрабуюць стоп-працэнтнай «яўкі выбаршчыкаў» і 99.9 галасоў «за» чарговыя праекты канстытуцыі, пераносы сьвятаў і г.д. Зноў будзе не да эканомікі?

**Віктар Людвіковіч.**

**На здымку: Аляксандр Дубко: «Час заняцца эканомікай ?»**

# ЗАЦЯГНІЦЕ ПАЯСЫ

**Бюджэт Гарадзенскай вобласьці ў 1996 годзе будзе выкананы толькі на 89%. Згодна афіцыйных папярэдніх падлікам, у дзяржаўную скарбонку недабярэцца каля 230 мільярдаў рублёў.**

Найбольш складаная сітуацыя склалася ў Мастоўскім і Навагрудзкім раёнах, дзе бюджэт за 9 месяцаў гэтага году быў выкананы адпаведна на 46.6 і 49%. Практычна не апраўдала сябе гарэлачная вайна, развернутая гарадзенскімі ўладамі супраць «чужых» моцных напояў дзеля латаньня бюджэтных "дзірак".

Страты бюджэту ад невыкананьня плану па збору акцызных падаткаў на гарэлку склалі за дзевяць месяцаў 24 мільярды. Яшчэ большыя страты - 30 мільярдаў-у выніку запазыкі прадпрыемстваў гандлю гарадзенскія вінаробы панесьлі на пераапрацоўцы гарэлкі з канфіскавага на мытні сьпірту. Да канца году ў распараджэньні ўладаў вобласьці засталося толькі 860 мільярдаў. З іх 777 мільярдаў неабходна выдаткаваць на зарплату, пенсіі, стыпенды, набыцьцё медыкаментаў,налічэньні на сацыяльнае страхаваньне. Да таго ж спатрэбілася знайсьці тэрмінова 22 мільярды на набыцьцё паліва для ўстановаў адукацыі і медыкаментаў для ўпраўленьня аховы здароўя аблвыканкаму.

На ўсе астатнія патрэбы-рамонт дарог, уборка сьмецьця, будаўніцтва дамоў засталося на апошні квартал толькі 60 мільярдаў. Стабілізацыя працягваецца...

**В.Дрэма**

# ЖАБРАК, ПАДАЙ КАПІТАЛІСТУ

**Апошнім часам па ўсёй Беларусі пракацілася хваля дэфіцыту на бензін, дызельнае паліва і іншыя нафтапрадукты. Сярод іншых прычынаў (непастаўка нафты з Расеі, адсутнасьць валюты на біржы, неплацяжы сярод спажыўцоў) дырэктар Лідзкага прадпрыемства па забесьпячэньню нафтапрадуктамі С.Калінскі назваў і такую.**

- Праз Беларусь, у тым ліку праз наш і суседскія раёны праходзіць нямала замежнага транспарту. Вось іх грузавыя машыны і запраўляюцца на нашых заправачных. Для замежных кіроўцаў гэта выгадна, бо паліва ў нас таньней, чым у Польшчы ці Германіі. Паліўныя ж бакі ў замежных аўтамашынах вялізныя-па 500-600 літраў. Зьмяніць такую сітуацыю аднаму нашаму прадпрыемству не пад сілу. Праблему трэба разглядаць на дзяржаўным узроўні.

**Яраслаў Грынькевіч.**

# ДРУЖБА ДРУЖБАЙ, А...

Апошнім часам пастаўкі ў Беларусь расейскай нафты сталі скарачацца. Паводле дадзеных канцэрну «Белнафтапрадукт», за 11 месяцаў гэтага году аб'ём паставак склаў 96,3 працэнты ў дачыненьні да аналагічнага леташняга перыяду. Сітуацыя асабліва абвастрылася ў кастрычніку-лістападзе. Так, з 723 тысячаў тон нафты, якія павінны былі па графіку паступіць у Беларусь у кастрычніку, у рэспубліку пастаўлена ўсяго 539,5 тысячаў. У лістападзе гэты разрыў павялічыўся яшчэ больш і склаў 754 і 437 тысячаў тон адпаведна.

**Яўген ГРУБІЧ.**

# ЧЫМ ЗАПРАЎЛЯЦЬ БУДУЦЬ?

На вуліцы Багуцкага ў Горадні фірма «Лукойл-Гродна» адкрывае новую аўтазапраўвачную станцыю. Зараз там вядуцца асноўныя мантажныя работы. Калі надвор'е паспрые, то адкрыцьцё адбудзецца ў пачатку студзеня наступнага году. Гэта будзе запраўка закрытага тыпу на чатыры віда паліва: бензін маркі 76,93,95, а таксама дызельнае паліва.

**С.С.**

# «ЗАЛАТАЯ ЗЯМЛЯ» У ГОРАДНІ

**29 лістапада ў памяшканьні Гарадзенскага лялечнага тэатру адбыўся аўкцыён па продажу гарадзкой камунальнай маёмасьці. З трох аб'ектаў, якія былі выстаўлены на 21-м аўкцыёне, толькі рэстаран «Зубр» прапанаваўся ва ўласнасьць. Але была пададзена толькі адна заяўка ад ахвотнікаў яго купіць. Па правілах аўкцыёну, рэстаран быў зьняты з продажу. Астатнія аб'екты здаваліся ў дзесяцігадовую арэнду.**

На працягу некалькіх хвілінаў першапачатковы кошт у 285 мільёнаў рублёў за права арэнды крамы «Мелодыя» вырас да 600 мільёнаў. За гэтую суму «Мелодыя» перайшла ў карыстаньне адной гарадзенскай фірмы.

Крама- філія ДГП «Задыяк», што разьмешчана па вуліцы Каліноўскага, 5 напрацавала 83 мільёны стратаў. Пры ўмове выплаты іх дзяржаве можна было атрымаць правы на краму за першапачатковы кошт 1 мільён 300 тысячаў рублёў.

Дырэктар венгерскай фірмы «Залатая зямля» Вераш Янаш спыніў гандаль літаральна пасьля яго пачатку. Венгр прапанаваў выплаціць за арэнду крамы дзесяць мільёнаў рублёў. У канкурэнтаў адразу зьнікла жаданьне гандлявацца.

Пасьля сканчэньня аўкцыёну на пытаньне карэспандэнта «Пагоні», ці не палохае яго сітуацыя на Беларусі, спадар Янаш адказаў:

- Той, хто займаецца бізнесам, павінен быць гатовы да зьмены сітуацыі. Паўгода назад мая фірма арыентавалася на імпарт. Але эканамічнае становішча на Беларусі вымушае перагледзець планы. Пры ўмове існаваньня двух курсаў даляру імпарт немагчымы. Таму мы і вырашылі набыць краму.

***-Чым Вы плануеце ў ёй гандляваць?***

-Мы зьбіраемся прапанаваць пакупнікам беларускія і венгерскія вырабы. У Венгрыі прынята гандляваць у крамах разнастайнымі таварамі. Калі я атрымаю дазвол ад гарадзкіх уладаў, тое ж самае паспрабую зрабіць і ў вас. Супермаркет можа і не атрымаецца, але, спадзяюся, гарадзенцы змогуць у нас набыць неабходныя ім харчовыя і гаспадарчыя тавары.

**З. Генаш.**

# ЗАМЕЖНЫ КАПІТАЛ ПАКІДАЕ БЕЛАРУСЬ

Па зьвестках Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь на 1 сьнежня 1996 году толькі каля 10% прадпрыемстваў розных формаў уласнасьці, у статутным фондзе якіх ёсьць замежны капітал, падалі заяўкі на перарэгістрацыю. Улічваючы, што на разгляд іхніх заяў трэба адзін месяц, то да першага студзеня (тэрміну заканчэньня перарэгістрацыі) ужо мала што зьменіцца.

У чыста беларускіх прадпрымальнікаў актыўнасьць крыху большая. Напрыклад, у Лідзе па зьвестках на 4 сьнежня г.г. заявы на перарэгістрацыю падало каля паловы бізнесменаў.

**Станіслаў Студнік**

**Ад рэдакцыі:** ***цікава, што будзе з грашыма, укладзенымі ў свой час замежнымі інвестарамі (ня менш як $20тыс.) у статутныя фонды сумесных і замежных прадпрыемстваў.***

# ЯКІЯ ЦЭНЫ Ў ВЯЛІКАЙ ПАЛІТЫЦЫ?

**Два тыдні таму зь Лідшчыны былі вывезены расейскія ядзерныя ракеты, якія так доўга не хацеў аддаваць прэзідэнт Лукашэнка.**

**Урачыстыя провады апошняй «Таполі» адбываліся 27 лістапада ў прысутнасьці міністра абароны Расеі Ігара Радзівонова, амбасадара ЗША К.Яловіца, прыпалітычных дзеячоў Беларусі Віктара Шэймана ды Сяргея Лінга.**

Аперацыя па экстранаму вываду расейскіх ракетаў зь Беларусі ва ўмовах рэзка негатыўных адносін да гэтай акцыі беларускага кіраўніцтва яшчэ доўга, калі не заўседы, будзе пакрыта заслонай таемнасьці. Застаецца толькі гадаць, чаму гэты вывад адбыўся менавіта ў ноч перамоваў Віктара Чарнамырдзіна з А.Г.Лукашэнка, Шарэцкім і В.Ціхінем. Трэба гэта разумець, што нашага «бацьку» па-буйному «накалолі» і пакуль ён «шукаў кампрамісу» з апазіцыяй, ракеты каціліся за Воршу, ці наадварот, Лукашэнка «прадаў» расейцам іхнія ж ракеты «здачу» беларускага парламента.

Разам з тым вывазам апошняй «Таполі» гісторыя з «беларускімі» ракетамі не скончылася, а толькі пачалася. Цяжка сказаць, ці мінула апошняя папяліна Воршы на той момант як Віктар Чарнамырдзін аказаўся ў Францыі. І палумільярда даляраў ад міжнароднага валютнага фонду легла ў бюджэт Расеі. Адтэрмінаваны выплаты ранейшых пазыкаў. Захад гатовы дапусьціць на свае рынкі ранейшыя каштоўныя паперы, што дае Расеі яшчэ некалькі мільярдаў.

Пасля Парыжу - Познань. Адкрыцьце газапроводцу на вельмі выгадных для Польшчы ўмовах. За гэта Польшча мусіць быць больш згаворлівай па пытаньнях сяброўства ў НАТА.

На момант напісаньня артыкула Чарнамырдзін - у Лісабоне. У яго калодзе лідзкія ракеты, яўнае паляпшэньне эканамічнай сітуацыі, падлашчаны да Польшчы, ну і само сабой Расея мірная (вайна ў Чачні спынена), і стабільная, і вялікая.

А што ў руках у у Лукашэнкі? Трасктатня пра беларускую ініцыятыву ў пытаньні стварэньня бязъядзернай зоны і міжнародная ізаляцыя ў сувязі з самымі важнымі для Захада пытаньнямі, пытаньнем правоў чалавека.

Вось у які шэраг падзей сталі «Лідзкія « ракеты і вось які «нуль» займела ад гэтага Беларусь. І ці выйграе Чарнамырдзін гэтую партыю з Захадам ці прайграе, беларускі «нуль» можа толькі пакрупнець ці пахудзець, але так «нулем « і застанецца.

**Станіслаў Суднік**

# АМНІСТЫЯ!.. АМНІСТЫЯ?

**Ад 5 лістапада дзейнічае закон Рэспублікі Беларусь аб амністыі. Але апублікаваны ў друку ён быў толькі на мінулым тыдні. Гэта выклікала шмат пытаньняў у чытачоў «Пагоні». Людзей цікавіла, ці не зьяўляецца акт падпісаньня закону перадрэферэндумным прапагандысцкім трукам. А замоўчваўся зьмест амністыі, каб не расчараваць асуджаных або не палохаць насельніцтва выхадам злачынцаў на волю.**

**На гэтае і іншыя пытаньні нам адказаў намесьнік начальніка УУС Гарадзенскага аблвыканкаму па выкананьню пакараньня Анатоль Нікалаевіч.**

- Тое, што закон апублікаваны не адразу - звычайная зьява,- кажа Анатоль Фёдаравіч.- У дзень падпісаньня тэкст амністыі ніколі ў друк не трапляе. А на выкананьне яе даецца паўгода.

Закон, які быў прыняты 5 лістапада, рыхтаваўся даўно. Ён ня быў прымеркаваны да якой-небудзь даты. У рэспубліцы склалася такое становішча, што месцы зьняволеньня перапоўнены на 30% звыш ліміту. Гэта не дазваляе ўтрымліваць людзей у нармальных умовах.

***- А колькі месцаў зьняволеньня ў Гарадзенскай вобласьці, і колькі людзей там знаходзіцца?***

- Такіх месцаў у нас тры. Турма строгага рэжыму ў Горадні. У ёй сядзіць больш 500 чалавек падследных, якія чакаюць суду. Каля 300 чалавек, якія ўжо адбываюць пакараньне. Гэта людзі, якія былі пераведзены з калоніяў за парушэньне рэжыму ўтрыманьня, або трапілі сюды па выраку суду. Ваўкавыская калонія строгага рэжыму. У ёй знаходзяцца 3 тысячы 400 чалавек. Навагрудзкі ЛТП. Там утрымліваюцца 680 чалавек, якія па рашэньню суду накіраваны на прымусовае лячэньне ад алкагалізму. Па нашаму заканадаўству, яны павінны сядзець за плотам. Зараз разглядаецца пытаньне аб закрыцьці ЛТП. Лячыць павінны лекары, а не міліцыя.

***- Грамадзтва да амністыі ставіцца па-рознаму: з аднаго боку, дрэнна, што ў турме можа апынуцца чалавек за крадзеж меху бульбы. А з другога- людзі баяцца выхаду на волю небясьпечных злачынцаў.***

- Калі прачытаць артыкулы 1-7 закону, то можна заўважыць, што вызваляцца будзе вельмі абмежаваная колькасьць зьняволеных. Амністыя датычыць толькі той катэгорыі асобаў, якія зьдзейсьнілі нязначныя злачынствы. І толькі пры ўмове добрых паводзінаў пад час зьняволеньня. Згодна артыкулу 8, не амністуюцца асуджаныя за цяжкія злачынствы.

***- Як будзе праходзіць амніставаньне?***

- Закон будзе прыменены індывідуальна да кожнага асуджанага, які падпадае пад артыкулы 1-7. Калі чалавек не парушыў рэжыму захоўваньня і на яго распаўсюджваецца закон аб амністыі, яго вызваляць.

У артыкуле 7 гаворыцца аб звальненьні асуджаных на тэрмін не больш за 5 гадоў пры ўмове, калі яны адбылі не менш паловы тэрміну пакараньня. Зразумела, таму, каму не хапае некалькіх тыдняў, каб падпасьць пад амністыю, будзе крыўдна. Але ў нас ёсьць такі інстытут, як датэрміновае звальненьне, па якому і такія зьняволеныя могуць быць вызваленыя пры ўмове добрых паводзінаў.

***- А колькі людзей увогуле плануецца вызваліць?***

- Амністыя датычыць асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў калоніях агульнага і ўзмоцненага рэжыму зьняволеньня пакараньнем на тэрмін да пяці гадоў. Пры чым яны павінны падпадаць пад артыкулы 1-7 закону.

Што датычыць Гарадзенскай вобласьці, дык у нашай турме сядзяць небясьпечныя злачынцы, якія ня будуць вызваляцца. У Ваўкавыскай калоніі знаходзяцца людзі, асуджаныя два і больш разы. Нейкую колькасьць амністуюць, але такіх будзе ня шмат. ЛТП не адносіцца па закону да месцаў зьняволеньня за злачынствы, а амністыя датычыць толькі злачынцаў.

Дакладную лічбу амніставаных пакуль сказаць цяжка. Я думаю, што яна будзе невялікая.

**Дз.Кісель.**

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# КУЛЬТУРА, КАНФЕСІІ

## 400 ГАДОЎ БЕРАСЬЦЕЙСКАЙ ВУНІІ

**Пад такой назвай 16-17 лістапада 1996 году ў Лондане адбылася навуковая канферэнцыя з удзелам беларускіх і ангельскіх навукоўцаў. Яе арганізавалі Беларуская каталіцкая місія ў Англіі, Беларуская бібліятэка імя Скарыны і Таварыства вывучэньня сярэдніх вякоў Усходняй Еўропы.**

Першы дзень канферэнцыі слухаліся даклады на ангельскай і беларускай мовах, другі дзень быў беларускамоўны. Моўных бар'ераў паміж гісторыкамі ,у асноўным, не было. Выступоўцаў было запланавана няшмат- усяго 10. Затое прыбылі ўсе запрошаныя: з Лондану, Антвэрпену, Прагі, Менску і Горадні- і зрабілі грунтоўныя-па 40 хвілін-даклады па сваіх праблемах. Пасля кожнага выступу ішло такое ж грунтоўнае яго абмеркаваньне- нясьпешна, з мноствам пытаньняў, рэплікаў, каментараў. Досьвед, варты для перайманьня арганізатарамі навуковых імпрэзаў: колькасьці (дзесяткам 10-15 хвілінных дакладаў) павінна саступіць месца якасьць і навуковая глыбіня.

З Беларусі было 5 сьпецыялістаў у галіне вуніязнаўства. Яны прадстаўлялі Інстытут этнаграфіі, мастацтвазнаўства і фальклору Акадэміі Навук рэспублікі, Беларускі дзяржаўны універсітэт і Гарадзенскі дзяржуніверсітэт, а таксама Люблінскі універсітэт.

Праграма канферэнцыі далёка выйшла за храналагічныя межы вуніі-1596-1839 гг. Яна ахапіла вялікі перыяд ад перадгісторыі вуніі ў XV стагоддзі да яе сучаснага адраджэньня.

Агляд гісторыі вуніяцкай царквы даў сп. Аляксандр Надсан, супрацоўнік бібліятэкі імя Ф.Скарыны , што ў Лондане, на базе якой праходзіла канферэнцыя, і якая ветліва расчыніла свае дзьверы перад гасьцямі з Беларусі. Яны ўбачылі тут асяродак беларускасьці, кавалачак Бацькаўшчыны на далёкай заходнееўрапейскай ускраіне. Сам А.Надсан шмат папрацаваў над арганізацыяй гэтай навуковай сустрэчы. «Вунія на Беларусі, пра якую думалі , што яна мёртвая , аказваецца, толькі спала»,- падвёў ён свой выступ да дня сёньняшняга.

Даследчык з Антвэрпену Франціс Томсон зрабіў агляд шляху беларуска-украінскай царквы ад Фларэнцыі да Берасьця. Ён паказаў, што ідэя вуніі прыйшла да нас ня з Берасьця , а з XV ст., з утварэньня Вялікага княства Літоўскага і яго аб'яднаньня з Польшчай-пытаньне пра аб'яднаньне цэркваў паўстала ў дзяржаве ўжо праз некальскі гадоў пасьля Крэўскай вуніі. Адзін з выступаў быў прысьвечаны моўным асьпектам рэлігійнага жыцьця ў княстве ў пачатку XVII ст.

Вялікую цікаўнасьць выклікаў амаль 1.5 гадзінны даклад «Вуніяцкія іконы Беларусі XVII і XVIII ст.ст.» ,падрыхтаваны прафесарам Ю.Хадыкам, але агучаны даследчыкам-мастацтвазнаўцам А. Хадыкам на ангельскай мове. Няма ніводнай работы, як адзначыў выступоўца, дзе б вуніяцкае мастацтва падавалася б як нацыянальнае, у лепшым выпадку яно падаецца як нейкае рэлігійнае. Ён прааналізаваў асноўныя этапы фарміраваньня і разьвіцьця вуніяцкага іконапісаньня . Знайшоўшы ў 50-60 г. XVII ст. у кампрамісе ўсходняга і заходняга мастацтва свой стыль ,вуніяцкая ікона з сярэдзіны гэтага стагоддзя пачынае аказваць зваротны ўплыў на каталіцкае і праваслаўнае мастацтва. У ёй прасочваецца нарастаньне сакральнага дэмакратызму. З другой паловы XVIII ст. зьяўляецца іканаграфічная навацыя- імпрэсіянізм. У сьпецыфічных умовах беларускай гісторыі вуніяцкае мастацтва было спосабам нацыянальнага яднаньня. Пасьля ліквідацыі вуніі яе культурная спадчына аказалася незапатрабаванай на радзіме, а цяжкія наступствы акту 1839 г.не пераадолены да нашага часу.

Слухачы на працягу канферэнцыі мяняліся - адных больш цікавілі выступы ангельскіх дасьледчыкаў, другіх- беларускіх. Мяркуючы па колькасьці прысутных, найбольшую цікавасьць для лонданскіх навуковых і беларускіх эміграцкіх колаў уяўляла «беларуская частка» канферэнцыі. Таму даклад аб вуніяцкіх іконах у беларускамоўным варыянце быў прачытаны на другі дзень канферэнцыі. Тады ж прагучалі выступы беларускіх гісторыкаў з Горадні, Менску, Прагі па наступным праблемах: умовы Берасьцейскай вуніі, этнічная самаідэнтыфікацыя і ідэнтыфікацыя беларускіх вуніятаў, скасаваньне вуніяцкай царквы на Беларусі, вуніяцкі рух у пачатку XX ст. , сацыяльны партрэт сучаснага грэка-каталіка. Так, абмяркоўваючы апошні даклад, удзельнікі прыйшлі да высновы, што вуніяцтва з «мужыцкай веры», якой яно лічылася ў XVII-XIX ст. пераўтварылася ў элітарную, але гэта вера эліты прыгнечанай , апальнай .

У дні работы канферэнцыі ў беларускай грэка-каталіцкай царкве, што знаходзіцца побач з бібліятэкай , праводзілася музычная літургія, у час якой прагучала малітва за Беларусь, служыліся вячэрні, адбылася сустрэча беларускіх удзельнікаў у Лонданскім універсітэце з выкладчыкамі Школы славянскіх студыяў , прагледжаны відэафільм «Пачаткі адраджэньня Вуніяцкай Царквы ў Беларусі» (1990 г.), арганізавана выстава кніг па гісторыі вуніі, што зьберагаюцца ў бібліятэцы.

**Сьвятлана Марозава.**

## ФАЛЬКЛОРНЫ ЗЫЧНЫ ЗВОН

**Сапраўднае фальклорнае сьвята чакала тых, хто ў суботу наведаў фінал трэцяга гарадзкога фестывалю нацыянальных абрадаў. Шматгадзінная праграма не пакінула абыякавым нікога .**




Выступы самадзейных калектываў былі разьмеркаваны паводле храналагічнага каляндарнага цыклу. Аўтарытэтнае журы на чале з Васілём Ліцьвінкам (Старшынём Асацыяцыі фальклярыстаў Беларусі) вызначыла наступных лаўрэатаў (у фінале спаборнічалі 14 ансамбляў): 9-я сярэдняя школа( восеньскае сьвята Кузьмы і Дзям'яна), 21-я СШ (прадстаўленьне «Бегла Каляда»), 35-я СШ («Купальле»), новастворааны ансамбль народнай песьні «Росьніца» з «Піліпаўскімі вячоркамі», ансамбль «Медуніца» (завод карданных валаў) з абрадам «Хрэсьбіны». Адпаведна глядзеліся і астатнія ўдзельнікі. Фэст прадэманстраваў адраджэньне пракаветных абрадавых звычаяў і традыцыяў. Вось ужо сапраўды ня ўсё згасла, што занядбана.

**Ладзік Майніч**

На здымку: «Купальле» ладзіць СШ N35.

## ТОЛЬКІ ПРАВАСЛАЎЕ ВЫРАТУЕ ФРАНЦЫЮ

**21 лістапада ў Лідзе адбылося асьвячэньне былога касьцёлу піяраў, а зараз праваслаўнага Катэдральнага сабору архістраціга Міхаіла.** Асьвячэньне правялі архіепіскап Беластоцкі і Гданьскі Сава, епіскап Гарадзенскі і Ваўкавыскі Арцемій, епіскап Наваградзкі і Лідзкі Гурый. З казаньнем на расейскай мове, але з польскім акцэнтам, да вернікаў зьвярнуўся архіепіскап Сава: «...Барацьба сіл дабра і сатаны ня скончылася. Шкада, што і ў вашым горадзе прайшла трэшчына паміж вернікамі (Цікава, што мелася на ўвазе: ці тое, што ўлады гвалтоўна перадалі касьцёл пад царкву , ці тое, што большасьць праваслаўных гораду выйшла ў аўтакефалію) і нават на асьвячэньне сабору прыйшло чалавек 200. Неабходна як мага хутчэй пакаяцца, прымірыцца, прыйсьці да адзінства мудрасьці. Усё гэта нясе і даруе сьвету Праваслаўе». Падзяліўся ўражаньнямі пра нядаўнюю паездку ў Францыю: «Там зарасьлі сьцяжынкі да храмаў, людзі аддаюць перавагу залатому цяльцу, розным відам абалваньваньня, растленьня праз індустрыю фільмаў, тэлепраграмаў, так званай масавай культуры, якая спрабуе ўплываць на нас. І мы павінны ганарыцца, што нашае праваслаўе супрацьстаіць духоўнай цемры Захаду... Духоўная філасофія праваслаўя сілкуе ўвесь сьвет».

Цікава, ці ведае сьвет пра гэта.

**Вацлаў Сярпінскі.**

## НЕ ЗРУЙНАВАЦЬ ІМ ВЕРУ!

**400-я ўгодкі царкоўнай вуніі 1596 году ўрачыста адзначаліся ў Берасьці 30 лістапада. На сьвяткаваньне зьехаліся вуніяцкія суполкі з усёй Беларусі: Магілёву, Горадні, Полацку, Менску , Пінску, іншых гарадоў краіны. Наведаліся таксама браты і сёстры з украінскіх базыльянскіх кляштараў- Львоўскага і Івана-франкоўскага. Зрабілі свой традыцыйны «ўнёсак» у сьвята мясцовыя ўлады.**

Жалобнае набажэнства ў памяць пра падзею і нашых продкаў на месцы царквы Сьвятога Мікалая (зараз гэта тэрыторыя Берасьцейскай крэпасьці) , дзе была абвешчана царкоўная вунія, забаранілі. Давялося абмежавацца кароткай ліціяй і нягучнай малітвай. Пасьля гэтага ўдзельнікі на зямлі, дзе расейцы зруйнавалі гістарычную царкву, выставілі ў выглядзе крыжа сьвечкі. Праграму дня працягнула ўрачыстая літургія ў адным з касьцёльчыкаў на ўскрайку Берасьця. Імша , у якой бралі ўдзел герархі: папскі нунцый , біскуп Варшаўскі і Перамышльскі , апостальскі візітатар для грэка- каталікоў Беларусі , амаль усе вуніяцкія сьвятары краіны, доўжылася каля дзьвюх гадзінаў. Пасьля адбыліся навуковыя выступы. Грунтоўнае спавешчаньне мела Сьвятлана Марозава- кандыдат навук з Горадні. Завяршылася ўсё невялічкім канцэртам і малітвай за беларускі народ.



**Выява царквы Сьвятога Мікалая з Візітацыйнай кнігі XVIII ст.**

Сьвяткаваньне выразна паказала, што шматпакутная грэка-каталіцкая царква на Беларусі спакваля адраджаецца. Не зважаючы на ўціск і дыскрымінацыю з боку дзяржаўнай улады ,якая падтрымлівае толькі «правільную» веру і нішчыць іншыя канфесіі . Нягледзячы на халоднае стаўленьне апостальскай сталіцы , якая баіцца сапсаваць стасункі з РПЦ і часьцяком падае вунію як чыста ўкраінскую зьяву . Сама ідэя вуніі зыходзіць са сьвятога Евангельля , сягае ў сучаснасьць з глыбіні вякоў. І таму будзе жыць, колькі будзе існаваць сьвет.

**Хельмут Каменскі.**

## «TRZEPOT WIECZNOSCI»

**Пад такой назвай выйшла ў Лідзе на польскай мове кніга берасьцейскай паэтэсы Марыі Сулімы. Выдала кнігу,скарыстаўшы з нядаўна атрыманай ліцэнзіі на выдавецкую дзейнасьць Таварыства польскай культуры на Лідшчыне. Прапануем чытачам адзін з вершаў Марыі Сулімы ў перакладзе на беларускую мову.**

*Сьвятыя словы*
*Бог, гонар, Айчына -*
*Сьвятыя ўсе словы*
*На нашай краіне*

*І ў нашых галовах.*
*Так бацька навучаў,*
*Матуля шаптала,*
*А сьлёзы пякуча*

*Да сэрца сьцякалі.*
*А лёс не суцішыў*
*Віхор той шалёны,*
*Што край мой панішчыў*

*І дом мой напоўніў.*
*Як тату праводзіла*
*У бой за радзіму,*
*Тры словы на памяць*

*Ён мне ўсё ж пакінуў.*
*Айчыну скрывавілі,*
*Скралі ў нас Бога,*
*Мой гонар стапталі,*

*Зрабілі нябогай.*
*Ды толькі праз гора,*
*Праз ганьбу, праз кпіны*
*Цьвярджу, як учора, -*

*Бог, гонар, Айчына.*
*На горнай чужыне*
*Шапчу тыя словы -*
*Бог, гонар, Айчына -*

*На прашчураў мове.*
*І дзецям, і ўнукам*
*Праз час ліхалецьця*
*Пакіну ў тэстамант*

*Тры словы на сьвеце.*
*Бог, гонар, Айчына...*

## НАШ КАЛЯНДАР

**6 СЬНЕЖНЯ**

**1705 г.** У Горадні адбылося асьвячэньне касьцёлу езуіцкага кляштару ў гонар Францішка Ксаверыя . Прысутнічалі кароль Аўгуст II і цар Пётр I.

**7 СЬНЕЖНЯ**

**1824 г.** У маёнтку Тупальшчына (цяпер Смаргонскі раён) нарадзіўся Юльян Бакшанскі,удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху,публіцыст.



**1878 г.** У вёсцы Навасады на Ашмяншчыне нарадзіўся Андрэй Зязюля (Астрамовіч), дзеяч беларускага каталіцкага руху, паэт. Жыў у Гальшанах, Вішневе, Трабах.

**8 СЬНЕЖНЯ**



**1937 г.** Расстраляны Ігнат Дварчанін , удзельнік заходнебеларускага руху, доктар філасофіі, паэт, літаратуразнавец. Нараджэнец вёскі Погіры (Дзятлаўскі раён).

**9 СЬНЕЖНЯ**

**1891 г.** У Менску нарадзіўся Максім Багдановіч (105 гадоў таму), класік беларускай паэзіі. Дзяцінства яго прайшло ў Горадні (1892-1896).

**10 СЬНЕЖНЯ**

**1930 г.** У вёсцы Вецявічы (Слонімскі раён) нарадзіўся Мікола Арочка, доктар філалагічных навук, паэт, празаік, перакладчык, літаратуразнавец .

**12 СЬНЕЖНЯ**



**1586 г.** У Горадні (410 гадоў таму) памёр Стэфан Баторы (Сьцяпан Батура), кароль Рэчы Паспалітай , дзяржаўны дзеяч,палкаводзец, які вызначыўся перамогай над расейскімі войскамі ў Лівонскай вайне.Апалагет езуітаў.

**13 СЬНЕЖНЯ**

**1835 г.** У Горадні нарадзіўся Уладзімір Гіргас, лінгвіст-усходазнаўца, магістар арабскай слоўнасьці.

**Падрыхтаваў Ул. Хільмановіч.**

## К Р Ы Ж А В А Н К А

*Перакладзі на беларускую мову*



**Па гарызанталі:** 5.Пример. 6.Часовой.10.Ремень. 11.Отжиг. 12.Учитель. .15.Голь, голытьба. 18.Трепалка. 19.Повойник. 20.Возчик. 21.Здание. 25.Верстак. 26.Колодец. 27.Падающая звезда. 31.Выручка,спасение. 33.Вред. 34.Кружка. 35.Тряпичник. 36.Счёт.

**Па вертыкалі:** 1.Льдина. 2.Котомка. 3.Валёк. 4.Склока,ссора. 7.Плаун. 8.Привртник. 9.Пакля. 13.Отношение (к чему-нибудь). 14.Бред. 16.Ромашка. 17.Свёрток. 22.Хрестоматия. 23.Перекладинаб, жердочка. 24.Угол. 28.Верх печи, лежанка. 29.Полевая жаба. 30.Призрак. 32.Сахар.

**Адказы на крыжаванку , зьмешчаную ў папярэднім нумары:**

**Па гарызанталі:** 7. Пакунак. 8. Паветра. 12. Бярэмя. 13.Барва. 14. Рызыка. 15. Воцат. 16. Праснак. 19. Гайня. 22. Скруха. 24. Павець. 26. Ратаваньне. 27. Бома. 28. Нуда. 30. Вядомасць. 32. Каралі. 33. Карнік. 34. Позва. 36. Прамень. 40. Багун. 44. Скарга. 45. Спрыт. 46. Адонак. 47. Кветнік. 48. Аўторак.

**Па вертыкалі:** 1. Гарэза. 2. Муляр. 3. Гарбар. 4. Павага. 5. Цемра. 6. Прызба. 9. Вячоркі. 10. Трус. 11. Аканіца. 17. Апрацоўка. 18. Намаганне. 20. Чаравік. 21. Апенька. 23. Умова. 25. Водар. 29. Валошка. 31. Кірунак. 35. Ворыва. 37. Росціс. 38. Мара. 39. Натоўп. 41. Аполак. 42. Саета. 43. Шашок.

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



## СПОРТ

# НЕ ПРАЙШЛІ

**Гарадзенскі «Камунальнік» выбыў з розыгрышу Кубку Еўрапейскай канфедэрацыі валейболу. У кваліфікацыйным турніры з удзелам чатырох камандаў, які праходзіў у Чанстахове, гарадзенцы занялі трэцяе месца. Вынікі турніру каментуе галоўны трэнер «Камунальнікаў» Анатоль Паняшын:**

-У першай сустрэчы нам супрацьстаяла адна з найлепшых камандаў Турцыі-стамбульскі «Нетас». Аб багатых фінансавых магчымасьцях і сіле турэцкага клубу сьведчыць той факт, што трэнеруе яго былы трэнер зборнай СССР Генадзь Паршын. У складзе «Нетасу» гуляюць чатыры гульцы зборнай Турцыі, у тым ліку лепшы нападнік гэтай краіны, а таксама лепшы пасуючы Польшчы Дарыюш Станіцкі і моцны расейскі легіянер Андрэй Waранцоў.

Лічу, што згулялі супраць туркаў мы прыстойна, змагаліся ў кожнай партыі(лік па партыях 10:15,8:15,13:15). Але клас туркаў усё ж сказаўся.

На наступны дзень даволі лёгка мы перамаглі кішынёўскі «Малдоўгідрамаш» (15:3,15:3,15:2), а ў першы дзень зімы саступілі чанстахоўскаму «Явалю». Гульцы гэтай каманды на сёньня складаюць аснову зборнай Польшчы. Трое з іх- Стэльмах, Грушка і Новак гулялі на Алімпіядзе ў Атланце. Практычна ўсе гульцы вышэй за два метры. Усё гэта і прадвызначыла зыход сустрэчы не на нашую карысьць(7:15,6:15,4:15). У рашальнай гульні турніру палякі саступілі 1:3 «Нетасу», які і працягне барацьбу за Кубак.

***- Шанцы «Камунальніка» ад пачатку былі мізэрнымі?***

- Мы не маглі выйсьці з гэтай групы. Хіба толькі пры ўмове, што турнір праходзіў бы ў Горадні, і мы ў кожнай сустрэчы дэманстравалі лепшую сваю гульню, што вельмі праблематычна.

***-Калі гарадзенскія аматары валейболу ўбачаць каманду ў родным горадзе?***

-Чэмпіянат краіны доўжыцца паўтара месяца, а мы згулялі ў ім толькі сем гульняў. З іх ніводнай дома. Гэта проста пародыя. Калі б не адзіная еўракубкавая сустрэча супраць харватаў, гарадзенцы ўвогуле ня ўбачылі б да новага году «Камунальнік» у справе.Найбліжэйшыя гульні на сваёй пляцоўцы мы згуляем толькі 10-11 студзеня супраць «Заходняга Буга».

***-Планы на сезон.***

-Будзем змагацца за медалі чэмпіянату і паспрабуем заваяваць Кубак краіны, розыгрыш якога пройдзе ў траўні.

**Гутарыў Вітаўт Руднік**

# СПРЫНТ

Сёньня ў гарадзкім Лядовым палацы спорту пройдзе сустрэча чэмпіянату Беларусі па хакеі паміж «Нёманам» і менскім «Юнацтвам». Пачатак гульні ў 18.30. А напярэдадні гарадзенская каманда ў гасьцях правяла чарговыя матчы ў першынстве Усходне-Еўрапейскай хакейнакй лігі супраць польскай «Алімпіі». У абедзьвух сустрэчах "Нёман" перамог - 12:1 і 13:2.

* * *



У Тэгеране праходзіць чэмпіянат сьвету па грэка-рымскай барацьбе сярод студэнтаў. У складзе зборнай Беларусі ўдзел у ім бярэ гарадзенец Аляксандр Сідарэнка (вагавая катэгорыя да 90 кг). Узначальвае беларускую каманду заслужаны трэнер краіны, загадчык кафедры фізічнай культуры Гарадзенскага універсітэту Вячаслаў Максімовіч.

* * *



Хакеісткі гарадзенскага «Рытму» рыхтуюцца да ўдзелу у Міжнародным турніры, які з 3-га па 5-га студзеня пройдзе ў чэшскім горадзе Чэске-Будзіёвіцэ. Гэтыя спаборніцтвы building станучь апошнім сур'ёзным выпрабаваньнем для гарадзенскіх дзяўчат (а менавіта яны складаюць аснову зборнай Беларусі ) перад маладзёжным чэмпіянатам кантыненту, які пройдзе з 24 па 26 студзеня ў гэтым жа горадзе.



# КІНААФІША ГОРАДНІ

**«ГРОДНА»:** 6-7 сьнежня- «Ліза» - 11.40,15.20,17.10,19.10. «Адчыніце, паліцыя» - 9.50,13.30,21.00. Для дзяцей: 8 сьнежня - «Ералаш»-10.00. Відэа: 6-7 сьнежня - «Выхад у чырвонае», 8 сьнежня - «Незнаёмы з ложка» - 10.00,12.00,14.00,16.00,18.00,20.00.

**«Кастрычнік»:** 6-9 сьнежня - «Два паўдурка з парасём.» - 15.00,16.50,18.40,20.30. «Сканер-паліцэйскі» - 10.00 (ільготны),11.50,13.40,15.30. «[illegible]га» - 15.20,17.20. «Нявольніцы сэксу» (для дарослых) - 19.20,21.00.

**«Космас»:** 6 сьнежня - «Кліч каханьня» - 13.40,15.30,17.20,21.00. Відэа: «За мяжой закона.» - 12.30,14.30,16.20. «Небясьпека» - 18.30, 20.30. 7 сьнежня - «Водар каханьня Фан-Фан» - 13.40,15.30,17.20. «Дракула» - 19.00 Відэа: «Прыгоды» - 12.30,14.30,16.30. «Небясьпека» - 18.30 Дыскатэка -21.00. 8 сьнежня - «Шына - каралева джунгляў « - 10.00. «Водар каханьня Фан-Фан» - 11.50,13.40,15.10. «Дракула» - 16.50,19.00. Відэа: «Прыгоды» - 10.30,12.30,14.30,16.30. «Небясьпека» - 18.30. Дыскатэка - 21.00

**імя Пушкіна :** 6 сьнежня - «Пячорная брама» - 10.00,13.40. «Сабатаж» - 11.50. Для дзяцей: «Усе сабакі трапляюць у рай» (мультфільм) - 15.30. Дыскатэка для школьнікаў - 18.00. Дыскатэка - 21.00 7 сьнежня - «Пячорная брама» - 10.00, 16.00. «Сабатаж» - 12.00. «Ланцуг» - 14.00, 18.00. Дыскатэка - 20.00. 8 сьнежня - «Пячорная брама» - 16.00. «Сабатаж» - 12.00 «Ланцуг» - 14.00,18.00. Дыскатэка - 20.00.

**«Чырвоная зорка»:** аўтаадказчык 44-11-21.

**«Усход»:** аўтаадказчык 47-81-29.

# ГАРАДЗЕНСКІ ЎІК-ЭНД

**Гарадзенскі абласны драматычны тэатр:** 6 сьнежня - «Ход канём»- 19.00. 7 сьнежня- «У наступным годзе ў той жа час» - 19.00. 8 сьнежня-»Нам нельга бяз сябра» - 12.00. «Вар'яцкі Журдэн» - 19.00

**Гарадзенскі абласны тэатр лялек:** 7 сьнежня - «Канёк-гарбунок»-12.00 8 сьнежня - «Кот Васька і яго сябры»-12.00 **Гарнізонны дом афіцэраў:** Гастролі Мінскага тэатру сатыры і гумару «Хрыстафор». 10 сьнежня -«Ад Чыжоўкі да Камароўкі»-19.00. 11 сьнежня -«М и Ж»-19.00

**Выставачная зала абласнога аддзяленьня Саюзу мастакоў Беларусі** запрашае наведаць персанальную выставу акварэлі мастака Вацлава Даноўскага.

**Выставачная зала абласнога Дома тэхнічнай і мастацкай творчасьці вучнёўскай моладзі** (вул. Замкавая): 10 сьнежня - урачыстае адкрыцьцё І Гарадзкой выставы дзіцячага малюнку вядучых студый гораду-15.00 Працягваецца Міжнародная выстава дзіцячай фотатворчасьці «Гродна-96»

**Галерэя «У Майстра»**:перадкалядны распродаж.

**«Галерэя Тызенгаўза»**: выстава студэнтаў кафедры выяўленчага мастацтва мастацкага аддзяленьня факультэту педагогікі і псіхалогіі Гарадзенскага універсітэту імя Я.Купалы , прысьвечанай 5- годдзю з дня заснаваньня кафедры.

**Новы Замак:** працягвае працу мастацкая выстава «Нацюрморт» гарадзенскіх мастакоў канца XIX-XX ст.ст.

**Музей гісторыі рэлігіі:** выстава «Гарадзенскія храмы на старых паштоўках».

**Дом рамёстваў** (вул. Ажэшкі): выстава «З бабульчынага куфра».

**Палац культуры «Юнацтва»** запрашае наведаць юбілейную выставу дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва «Сугучнасьць» , прысьвечаную 10- годдзю з дня заснаваньня студыі.

**Палац культуры тэкстыльшчыкаў:** 6 сьнежня- шоў «З ноччу на «Ты».-21.00 8 сьнежня - Вечар адпачынку- 20.00

**К/тр «Гродна»:** персанальная выстава графічных твораў Валянціна Муліцы, якая адкрываецца 8 сьнежня а 14 гадзіне.

**Віталь Нікановіч.**

# ГАРАСКОП НА ТЫДЗЕНЬ

**Баран** (21.3-20.4) Нягледзячы на шматлікія абавязкі, неабходна знайсьці час для сям'і. Гэта можа зьмяніць планы. Але не зьвяртайце ўвагі. Галоўнае, што вернецца гармонія ў пачуцьцях і радасьць сямейнага жыцьця.

**Бык** (21.4-20.5) Чакаецца цяжкі тыдзень. Не плануйце шмат справаў і не папярэджвайце падзей. Затое будзе ўсё добра са здароўем, але сьцеражыцеся прастуды. Ужо сёньня чакае прыемная нечаканасьць.

**Блізьняты** (21.5-21.6) Выкарыстоўвайце добры час для вырашэньня цяжкіх справаў. Пасьля чаго можна заняцца домам і сям'ёй. Ні ў якім разе не будзьце ўпартымі ў справах, важных для каханага чалавека.

**Рак**(22.6-22.7) Чакае вас тыдзень шматлікіх сяброўскіх сустрэчаў. Нават захочацца застацца аднаму ў спакоі. Але не забывайце пра каханага чалавека.

**Леў** (23.7-23.8) Пачынаючы з нядзелі наплыў энергіі і добрага адчуваньня. Можна ўжо заняцца падрыхтоўкай да сьвятаў. Пачынайце купляць падарункі блізкім.

**Дзева** (24.8-23.9) Наогул удалы тыдзень. Толькі ў аўторак нехта на працы можа сапсаваць настрой. Але ўсё вырашыцца добра. Разам з посьпехамі на працы цудоўная атмасьфера дома.

**Шалі** (24.9-23.10) Перад вамі шмат працы. Трэба дакладна ацаніць свае магчымасьці. Лішнія праблемы можна адкласьці і заняцца сямейнымі справамі. Значнае паляпшэньне адносінаў з блізкім чалавекам.

**Скарпіён** (24.10-22.11) Надвор'е не адпавядае рамантычным памкненьням. Але што гэта за перашкода для сапраўднага каханьня. Знаходзіцеся пад уплывам Венеры, якая прывядзе Вас да новых сяброў.

**Стралец** (23.11-21.12) Дзякуючы Сонцу, Ваш знак чакаюць посьпехі ў кожнай справе. Можаце сьмела распачынаць любы бізнес. Але калі зьбярэцеся ў падарожжа, не забудзьцеся ўзяць з сабой цёплае адзеньне.

**Казярог** (22.12-20.1) Меркурый абяцае посьпех у сяброўстве. У адзінокіх ёсьць магчымасьць зьвярнуць на сябе ўвагу кагосьці з-пад знаку Дзевы.

**Вадалей** (21.1-19.2) Чакаецца цяжкі працоўны тыдзень . Але дапамогуць сябры, і ўсё будзе добра. Не забудзьцеся падзякаваць ім у пятніцу. А для каханага чалавека купіце падарунак.

**Рыбы** (20.2-20.3) Найбліжэйшыя дні спрыяюць паляпшэньню сямейных адносінаў. Агульныя справы, падрыхтоўка да сьвятаў зноў адкрыюць харасство вялікага каханьня.

# ПАМЯЦІ МАСТАЧКІ

**2 сьнежня ня стала Ліліі Уладзіміраўны Трохалявай, выдатнай беларускай мастачкі... На 72 годзе перастала біцца сэрца гэтага таленавітага чалавека.**

Адметная асаблівасьць яе твораў- гэта тонкае мастацкае бачаньне навакольнага сьвету, глыбіня яго адчуваньня , уменьне бездакорна, праўдзіва , у рэалістычнай форме перадаць красу беларускай прыроды. Яе работы насычаныя багацьцямі колеру. Яны цікавыя своеасаблівасьцю манеры выкананьня ,цэльнасьцю, завершанасьцю.

**Метадычны цэнтр народнай творчасьці ў Горадні адкрыў сёньня пасьмяротную выставу Ліліі Уладзіміраўны Трохалявай з твораў , якія знаходзіліся ў яго калекцыі.**

# УЗНАГАРОДА ПАЭТУ-ПАКУТНІКУ

**Напрыканцы лістапада Рада Таварыства Вольных Літаратараў прысудзіла сваю штогадовую літаратурную прэмію «Гліняны Вялес» паэту-вязьню Славаміру Адамовічу за зборнік «Каханьне пад акупацыяй», які сябрамі ТВЛ быў прызнаны лепшай паэтычнай кнігай 1996-га году.**

На вялікі жаль, сёлетні лаўрэат, знураны васьмімесячным зьняволеньнем у засьценках рэжыму, ня зможа афіцыйна атрымаць сімвалічную фігурку паганскага бога Вялеса. Затое ягоны зборнік «Каханьне пад акупацыяй» карыстаецца небывалай папулярнасьцю ня толькі ў патрыятычна настроеных грамадзян Беларусі, але й за яе межамі, пра што сьведчаць публікацыі ў амерыканскіх, польскіх, украінскіх, расейскіх ды інш. выданьнях.

* * *

У другой палове лістапада ў Выставачным павільёне міндэнскага тэатру з посьпехам прайшла выстава гарадзенскіх мастакоў Уладзіміра Голуба, Валянціны Шобы, Уладзіміра Качана і Юрыя Якавенкі. Гарадзенцы выбраліся ў горад-пабрацім Міндэн з творчай акцыяй паводле запрашэньня нямецкага боку ў межах культурнага абмену (увесну ў Горадні выстаўляліся нямецкія мастакі), а таксама скарысталіся мажлівасьцю наведаць музеі сучаснага мастацтва ў Брэмэне й Гановэры.

**Ігар ГАНДЛЕЎСКІ.**

# СТЭФАН БАТОРЫ ВЯРТАЕЦЦА Ў ГОРАДНЮ

12 сьнежня а 10 гадзіне ў тэатры Тызенгаўза ў Горадні распачне працу міжнародная навуковая канферэнцыя « Стэфан Баторы і Усходняя Еўропа яго часу.» Арганізатары канферэнцыі-аб'яднаньне «Ратуша», Заходнебеларускі гуманітарны цэнтр дасьледаваньняў Усходняй Еўропы, вабласная краязнаўчая асацыяцыя і музей гісторыі рэлігіі -шмат парупіліся, каб яна стала сапраўднай падзеяй у жыцьці гораду. Свае даклады прачытаюць вядучыя навукоўцы з Беларусі, Летувы, Польшчы , Венгрыі, Украіны і Расеі.

Падрыхтаваная і культурная праграма. Трынаццатага у тэатры Тызенгаўза адбудзецца канцэрт. Аматары сур'ёзнай музыкі змогуць пачуць Гарадзенскую Капэлу. Запрашаюцца ўсе ахвотнікі.

# АД РЭЧАІСНАСЬЦІ НЕ АДЫСЬЦІ.

**1 сьнежня ў Міжнародны дзень прафілактыкі СНІДу ў Гарадзенскім палацы культуры «Юнацтва» прайшла імпрэза «СНІД-ад рэчаіснасьці не адысьці», наладжаная Асацыяцыяй студэнтаў «G.A.R.P».**

Пад час імпрэзы прысутным была прадстаўлена праграма «Чыстае каханьне», прачытана лекцыя «Здаровае каханьне» .

Прысутныя ўбачылі выставу малюнкаў, у якой ўзялі ўдзел вучні гарадзенскіх школаў. У канцы імпрэзы журы на чале з Алесем Аўчыньнікавым назвалі пераможцаў выставы. Імі сталі Сяргей Барысёнак (СШ N 19),Лабацкі Сяргей (СШ N26 ) і Сукмач Тацьцяна (СШ N17).

Вялікую дапамогу ў арганізацыі гэтага мерапрыемства аказалі грамадскае аб'яднаньне «Ратуша», Музей гісторыі рэлігіі, ООО «Отто», інстытут «Гроднаграмадзянпраект».

**Віталь Нікановіч**
**Маладзёжны прэс-клуб.**

# «ПАГОНЯ» АБВЯШЧАЕ КОНКУРС

На лепшы фотаздымак на тэму «Мая сям'я». Прымаюцца любыя фотаздымкі з кароткімі тлумачальнымі тэкстамі. Лепшыя фотаздымкі будуць надрукаваныя на старонках газеты. Пераможца, якога вызначыць рэдакцыя, атрымае каштоўны прыз. Запрашаем. Скарыстайце з нагоды, зрабіце прыемнасьць сваім блізкім.

## КРЫМІНАЛ

# АМНІСТЫЯ ПАЧЫНАЕЦЦА

**Праца ворганаў МУС па ажыцьцяўленьню амністыі пачынае набываць канкрэтныя рысы. На мінулым тыдні ў Менску адбылася нарада супрацоўнікаў міліцыі, якія будуць выконваць закон аб амністыі.**

Прыкладна з 60 тысячаў зьняволеных па ўсёй краіне пад амністыю пападуць каля 8-10 тысячаў чалавек. Зараз праходзіць узгадненьне парадку правядзеньня амністыі з ворганамі пракуратуры, Міністэрства юстыцыі і Вярхоўнага Суду.

Сёньняшняя амністыя мае адметныя рысы. Напрыклад, яна распаўсюджваецца на тых крадальнікаў маёмасьці , якія цалкам пагасілі нанесеную ўласніку шкоду. Таксама будзе вызвалена ад пакараньня даволі шмат тых, хто асуджаны ўмоўна, з адтэрміноўкай пакараньня альбо да папраўчых работ.

# У ЛІДЗЕ НОВЫ ШЭФ МІЛІЦЫІ

Новага начальніка міліцыі прызначылі ў Лідзе. Гэта 40-гадовы Іван Змуршчык, які пераведзены сюды з Ваўкавыску. Яго чакае тут сур'ёзнае выпрабаваньне на прафесійную сталасьць: сітуацыя з крымінальнай злачыннасьцю ў Лідзе - ня з простых.

Былы шэф лідзкай міліцыі сп.Макаранка будзе служыць цяпер у сістэме ўпраўленьня ўнутраных спраў на транспарце.

# У ГАСПАДАРЦЫ ЎСЁ ПРЫДАСЦА

Менавіта так трэба разумець жыхара гораду Бярозаўка Б., які прыцягнуў дадому артылерыйскі снарад. Міліцыі ўдалося высьветліць толькі , што знайшоў яго гаспадарлівы чалавек на палігоне , і хоць за факт знаходкі караць нельга, але за незаконнае захоўваньне адказваць давядзецца.

ПАГОНЯ
ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына»
Рэгістрацыйны нумар 597
Падпісны індэкс 63124

Адрас рэдакцыі:
230023, г.Горадня, вул. Дамініканская,1
(0152) 72-35-61, 72-29-96
E-mail: andrei@pagonia.belpak.grodno.by
FREESPACE BBS 0152-72-37-14 (23.00-10.00)

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасьць за падбор і дакладнасьць фактаў, іх меркаваньні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі.
Адказнасьць за зьмест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Гарадзенская абласная узбуйнёная друкарня:
230023, г.Горадня, вул. Паліграфістаў, 4
Заказ 4013 Наклад 11169
Нумар падпісаны да друку ў 16.00, 5.12.96

Рэдактар Мікола Маркевіч

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013